# СКУЛЬПТУРНЫ ПАРТРЭТ БЕЛАРУСКАГА АРХІТЭКТАРА:ЗНАЧЭННЕ ДЗЕЙНАСЦІ ІОСІФА ЛАНГБАРДА

**Клютчэня Лізавета, Беларусь**
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Беларусь, Мінск*
*Навуковы кіраўнік – м.ф.н. старшы выкладчык Носік А. А.*

Анатацыя: артыкул прысвечаны асобе знакамітага архітэктара І. Лангбарда. Разглядаюцца яго асноўныя архітэктурныя помнікі у кантэксце гісторыі і сучаснасці.
*Ключавыя словы*: *мінская «тройца», Дом Ураду, Дом Чырвонай Арміі, Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр оперы і балета, Акадэмія навук.*

Іосіф Рыгоравіч Лангбард нарадзіўся 18 студзеня 1882 г. у невялікім мястэчку Бельск-Падляскі, у той момант Гродзенская губерня Расійскай імперыі. Скончыўшы ў 1901 годзе мясцовую гімназію, паступіў на архітэктурнае аддзяленне Адэскага мастацкага вучылішча, якое скончыў у 1906 годзе, У 1907 годзе ён ужо ў Пецярбургу, дзе паступае на архітэктурны факультэт Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў. Пад кіраўніцтвам Аляксандра Памяранцава Іосіф Лангбард у 1914 годзе выканаў дыпломны праект на тэму «Будынак Дзяржаўнага Савета».

Працы Іосіфа Лангбарда ўпрыгожваюць Кіеў, Самару, Оршу, Пецярбург, але сусветную вядомасць яму прынесла, так званая, мінская «тройца» – Дом Ураду, Дом афіцэраў і Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь, якая была пабудавана да вайны.

У 1929 годзе праводзіўся конкурс на праектаванне Дома Ураду, дзе канкурэнцыю Іосіфу Лангбарду склалі Л.В. Руднеў, І.І. Фамін, Н.А. Троцкі і іншыя таленавітыя майстры, але праца Іосіфа Рыгоравіча была прызнаная лепшай і рэкамендавана да ажыццяўлення без якіх-небудзь змяненняў і дапаўненняў. Першапачаткова ў праекце былі прадугледжаны плошча для правядзення дэманстрацый і ваенных парадаў і добраўпарадкаванне тэрыторыі з боку вуліцы Мяснікова, але пазней частка тэрыторыі была аддадзена пад забудову БДУ, і праект усё ж такі зведаў змены. Аднак Дом Ураду ў Мінску ўсё роўна стаў адным з лепшых твораў архітэктара. Гэты будынак так і застаўся самай буйной у рэспубліцы пабудовай грамадскай архітэктуры даваеннага часу. Аб'ём будынка роўны 220 тысячам кубічных метраў. Яго кампаноўка заснавана на сіметрычным нарастанні аб'ёмаў і вышыні – ад перыферыі да цэнтра. І нягледзячы на вялікія памеры, халодныя шэрыя тоны каменнай тынкоўкі і некаторае драбненне аб'ёмаў, будынак не здаецца груваскім і цяжкавагавым. Прааналізаваўшы працу архітэктара, можна чарговы раз пераканацца, што ён быў прыхільнікам вертыкальных архітэктурных рашэнняў. «Гарызантальная форма ўяўляецца як палажэнне спячага, альбо мёртвага, што дзейнічае прыгнятальна, –

Рэпазіторый БДМУ

адзначаў ён, – між тым як вертыкальнае становішча выказвае жыццё, бадзёрасць і сілу, яно супрацьстаіць пастаяннаму прыцягненню да зямлі».

Пасля завяршэння будаўніцтва Дома Ураду Іосіф Лангбард узяўся за праект Дома Чырвонай Арміі (1934-1939), цяпер Дом афіцэраў. Пры выбары месца архітэктар спыніў свой выбар на былым 2-павярховым будынку Архірэйскага падворка, чые падмурак і сцены былі выкарыстаны падчас будаўніцтва. Дом афіцэраў па праве можна назваць «усефасадным будынкам». Унікальнасць праекта заключаецца ў тым, што ў яго няма задворкаў. Кожны бок па-свойму варты ўвагі. З боку Аляксандраўскага сквера дэталі на фасадзе больш дробныя і выразныя. А ў двары Дома афіцэраў хаваецца аналаг адэскай пацёмкінскай лесвіцы. У 30-я гады XX стагоддзя прыступкі вялі прама да трох’яруснага Архірэйскага саду, а адтуль – да берага Свіслачы. Фасад, які знаходзіцца ўздоўж брукаванай дарогі па Карла Маркса, з вялікімі арачнымі вокнамі, упрыгожаны будзёнаўкай, што перадае даваенную атмасферу будынка. У Доме афіцэраў тварам да людзей размешчаны і бакавыя фасады. Фасад, які выходзіць на цяперашні праспект Незалежнасці, быццам бы шэры і глухі, без усялякіх вынаходстваў, але тым самым выводзіць на авансцэну іншы помнік архітэктуры – дом, пабудаваны да 300-годдзя царавання дынастыі Раманавых. Для Мінска даваенных гадоў Дом Чырвонай Арміі стаў унікальным у інжынерным плане аб’ектам: чатыры паверхі ўверх і столькі ж уніз, каля сотні залаў і пакояў агульнай плошчай у тры футбольныя полі.

У 1933 годзе быў пакладзены пачатак будаўніцтва Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета (Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь). Першапачаткова архітэктар атрымаў заданне спраектаваць універсальны будынак, у якім будуць устаноўлены механізаваная сцэна і вялікая зала для гледачоў. Аднак ужо ў працэсе будаўніцтва аўтару было прапанавана перагледзець праект з мэтай скарачэння ўсіх параметраў будынка. Адначасова змяняліся сцэнічныя памяшканні, давялося адмовіцца ад другога балкона. Вызначалася і прызначэнне будынка як тэатра оперы і балета. Усе гэтыя змены адбіліся на вонкавым абліччы збудаванні. Каб пазбегнуць прысадзістага збудавання, аўтару прыйшлося ўвесці 14-метровы штучны цыліндр над глядзельнай залай. Таксама скарачаўся каштарысная вартасць, якая спрашчае аздабленне фасадаў і інтэр'ераў, што прывяло да адмовы ад устаноўкі скульптур ў нішах на галоўным фасадзе. Адкрыццё тэатра адбылося ў 1939 г.

Іосіф Лангбард таксама з'яўляецца аўтарам галоўнага корпуса Акадэміі Навук. Першапачаткова праект быў даручаны Георгію Лаўрову. Будынак Акадэміі навук па яго праекце стаў тыповым узорам канструктывізму. Пачалося будаўніцтва. Але калі прыйшла пара пачынаць галоўны корпус, праект перагледзелі і адкінулі. Дапрацоўваць канцэпцыю будынка даручылі Лангбарду. Вядомы архітэктар злучыў бакавыя часткі будынка, якія ўжо будаваліся, агульным вестыбюлем і вонкавай двухрадковай каланадай. Створаны ім велічны вобраз упісаўся ў карціну, якая звязала разам існаванне навукі ад старажытнасці да нашых дзён. Праваднікам выступіў старажытны каменны гадзіннік на класічнай калоне. У ім увасобілася старажытныя навуковыя веды аб руху планет



Репозиторий БГПУ

вакол Сонца, аб градусе кручэння Зямлі. А бесперапынны ход часу на гадзінах сімвалізуе бясконцасць вывучэння матэрыі.

Гэтыя будынкі далёка не адзіныя работы Іосіфа Рыгоравіча, але менавіта за іх ён атрымаў сусветнае прызнанне, стаўшы ўладальнікам Гран-пры Сусветнай выставы ў Парыжы ў 1937 г. Больш таго, у Лангбарда засталося шмат так і не рэалізаваных ідэй аб захаванні ацалелых пасля вайны архітэктурных помнікаў і стварэнні новага Мінска з улікам беларускіх традыцый – урадам яны былі ўспрынятыя як мяшчанскія і буржуазныя. Так не ўбачыла свету трыумфальная арка, якая магла стаць упрыгожаннем Мінска, і многія іншыя праекты архітэктара. Нават нягледзячы на велізарную ролю, якую адыграў гэты чалавека у фарміраванні аблічча каля дзясятка сучасных гарадоў, асабліва Мінска, помніка яму нідзе няма. Няма і вуліцы, названай у яго гонар, і нават памятныя дошкі на яго будынках, за выключэннем тэатра оперы і балета, не ўстаноўлены. Але імя Іосіфа Рыгоравіча Лангбарда назаўсёды застанецца ў сэрцы карэнных мінчан.

### Літаратура

1. [Электронны рэсурс.] – [Рэжым доступу]: https://planetabelarus.by/-publications/iosif-langbard-ya-sdelal-dlya-belarusi-vse/. [Дата доступу]: 29.09. 2019.
2. [Электронны рэсурс.] – [Рэжым доступу]: http://mishpoha.org/n17/-17a21.php. [Дата доступу]: 26.09. 2019.
3. [Электронны рэсурс.] – [Рэжым доступу]: https://ru.wikipedia.org/wiki/-Лангбард,_Иосиф_Григорьевич. [Дата доступу]: 18.09. 2019.
4. [Электронны рэсурс.] – [Рэжым доступу]: https://www.kp.by/daily/-26834/3875099/. [Дата доступу]: 29.09. 2019.
5. [Электронны рэсурс.] – [Рэжым доступу]: https://bsc.by/ru/story/gran-pri-za-arhitekturu-belarusi. [Дата доступу]: 28.09. 2019.
6. [Электронны рэсурс.] – [Рэжым доступу]: https://ais.by/story/2292. [Дата доступу]: 29.09. 2019.
7. [Электронны рэсурс.] – [Рэжым доступу]: https://minsk-old-new.com/-places/primechatelnye-zdaniya/dom-pravitelstva. [Дата доступу]: 29.09. 2019.
8. [Электронны рэсурс.] – [Рэжым доступу]: http://www.ctv.by/novosti-minska-i-minskoy-oblasti/akademiya-nauk-belarusi-istoriya-stroitelstva-i-otrazheniya-v. [Дата доступу]: 29.09. 2019.

Репозиторий БГПУ

# THE SCULPTURAL PORTRAIT OF THE BELARUSIAN ARCHITECT: VALUE OF ACTIVITYJOSEPH LANGBARD

**Klyutchenya Elizaveta, Belarus**
*Belarusian State Medical University*
*Belarus, Minsk*
*Supervisor – m.f.n. Senior Lecturer Nosik A.A.*

Abstract.The article is devoted to the personality of the famous architect IM Langbard. Considers its main architectural monuments in the context of history and modernity.
*Keywords: Minsk «Trinity», the Government House, the House of the Red Army, the Belarusian State Academic Opera and Ballet Theater, the Academy of Sciences*

Репозиторий БГМУ